УДК 930+940
ББК 63.3(4Беи)+63.3(0)6
Г516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

***Рэдкалегія:*** першы прарэктар БДПУ, старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі *А.І. Андарала*;
доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *Г.А. Космач*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Люты*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У.В. Тугай*;
кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ *І.І. Багдановіч*;
дактары гістарычных навук, прафесары *В.А. Пілецкі* (адк. рэд.), *М.К. Сакалоў*, *В.М. Фамін*, *І.Р. Чыкалава*;
доктар гістарычных навук, дацэнт *М.І. Мініцкі*;
начальнік вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*;
кандыдаты гістарычных навук, дацэнты *І.В. Варывончык*, *А.Ф. Рацько*, *М.М. Сакалоў*, *А.Г. Субоцін*, *П.А. Тупік*, *Л.П. Шкуцько*;
кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык *З.І. Канапацкая*

**Гістарыяграфія** гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і
Г516 ЗША : матэрыялы Рэсп. навук-тэарэт. канф., г. Мінск, 28 сак. 2008 г. У 2 ч. Ч. 2. Гістарыяграфія новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША: даследаванні, праблемы, пошукі / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. А.І. Андарала, М.М. Забаўскі, А.П. Жытко [і інш.]; адк. рэд. В.А. Пілецкі. – Мінск: БДПУ, 2008.– 296 с.
ISBN 978-985-501-559-9.

У зборніку актуалізуюцца праблемы гістарыяграфіі новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША. Разглядаюцца асобныя пытанні Вялікай Айчыннай вайны. Даюцца слушныя рэкамендацыі па даследаванні гістарыяграфіі адзначаных краін свету.

Адрасуецца студэнтам і аспірантам, навукоўцам і грамадазнаўцам, усім, хто цікавіцца пытаннямі сусветнай гісторыі.

**УДК 930+940**
**ББК 63.3(4Беи)+63.3(0)6**

**ISBN 978-985-501-559-559-9 (ч.2)**
**ISBN 978-985-501-557-5**

© БГПУ, 2008

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – 453 с.; Яцкевіч, С. Лёсы нацыянальных меншасцей на Беларусі / С. Яцкевіч // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей. Мінск, 1997. – № 3. – С. 4–16.
9. Евдокименко, Н.Л. Проблемы становления и развития высшей школы Белоруссии (на материалах государственных и общественно-политических организаций (1921–1932 гг.)).: автореф. дис... канд. ист. наук: 07.00.01 / Н.Л. Евдоккименко; Бел. гос. ун.-т. – Минск, 1993. – 22 с.; Раманава, І.М. Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР 1921–1930 гг.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / І.М. Раманава; Ін–т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 1999. – 19 с.; Каспяровіч, А.М. Сярэдняя спецыяльная адукацыя Савецкай Беларусі у 20-х гадах XX стагоддзя: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.М. Каспяровіч; БДПУ.– Мінск, 2006.
10. Собрание узаконений и распоряжений Рабоче–крестьянского правительства Белорусской ССР. – Минск: Отдел Законодат. Предположений НКЮБ, 1924. – № 8. – 19 с.; Собрание узаконений и распоряжений рабоче–крестьянского правительства Белорусской ССР. Минск: Отдел Законод. Предположений НКЮБ, 1924. – № 11. – 16 с.; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. (1918–1927). – Минск: Беларусь, 1983. – 527 с.; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 2. (1928–1932). – Минск: Беларусь, 1984. – 511 с.

## Праблемы адукацыі нацыянальных меншасцей у пачатковай школе Беларусі ў 20-я гг. XX ст.: гістарыяграфія пытання

***І.І. Забаўская, г. Мінск***

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі дае наступную трактоўку тэрміна «нацыянальныя меншасці» – «групы насельніцтва пэўнай нацыянальнасці, якія расселены ў іншанацыянальным асяроддзі па-за межамі ўласных дзяржаўных утварэнняў або не маюць такіх» [1]. На беларускіх землях нацыянальныя меншасці вядомы з XII–XIII стст. Да іх адносяцца палякі, яўрэі, латышы, немцы, украінцы, татары, літоўцы, рускія, кітайцы, эстонцы і інш. Да пачатку XX ст. пералічаныя этнічныя супольнасці пэўным чынам інтэграваліся з тытульнай (беларускай) большасцю і прайшлі з ёй складаны, часамі трагічны шлях. Царскі ўлад не садзейнічаў развіццю нацыянальных культур народаў Расійскай імперыі, у тым ліку і Беларусі.

Спроба забяспечыць аўтаномныя правы нацыянальных меншасцей упершыню была зроблена ва Украіне, якая атрымала аўтаномію ад Часовага урада ў ліпені 1917 г. Быў прызначаны нават міністр па справах нацыянальнасцей. Але пасля акупацыі Украіны нямецкімі войскамі ў 1918 г. пачалася паласа пагромаў нацыянальных меншасцей. Яўрэйская аўтаномія ў 1918 г. была ўсталявана ў незалежнай Літоўскай рэспубліцы. Аўтаномію ўсе нацыянальныя меншасці атрымалі ў Эстоніі; у Латвіі – толькі ў галіне культуры. Навогул, стан нацыянальных меншасцей і школьнай справы у 20-я гг. XX ст. у большасці краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы даволі грунтоўна асветлены ў «Нарысах яўрэйскага народа» пад рэдакцыяй Эцінгера [2]. Перадумовы пабудовы нацыянальных школ у Беларусі у 20-я г. XX ст. аналізуе Т. Сухая [3].

У савецкі час пачаўся ўздым нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Як падкрэслівае У.В. Тугай, «пасля заканчэння грамадзянскай вайны да канца 1920-х гг. беларускі ўрад і беларуская інтэлігенцыя зрабілі шмат для развіцця культуры, свядомасці, адукацыі ўсіх нацыянальных меншасцей» [4]. І з гэтай высновай нельга не пагадзіцца. Урад БССР выпрацаваў і праводзіў работу з тым, каб даць магчымасці ўсім этнасам, якія працавалі ў рэспубліцы атрымаць адукацыю і выхаванне на сваёй роднай мове. Грунтоўная ўвага надавалася пазнанню асаблівасцей нацыянальных культур, арганізацыі адукацыйна-выхаваўчай працы на краязнаўчай аснове. Да 1927–1928 г. працоўныя пачатковыя школы па нацыянальнай адзнацы падзяляліся наступным чынам: беларускіх 4-годак – 4725 (91,5 %), яўрэйскіх – 148 (3 %), польскіх – 133 (2,5 %), расійскіх – 118 (2 %), іншых 4-годак – 39 (0,5 %). Менавіта такія звесткі прыводзіў у газеце «Асвета» нарком асветы БССР А.В. Баліцкі. Школьным перапісам ад 15 снежня 1927 г. колькасць вучняў па мовах навучання была прадстаўлена наступным чынам: беларуская – 296182 вучні, яўрэйская – 11212, польская – 6159, расійская – 11299 інш. – 2060.

Каштоўнай крыніцай па акрэсленай тэме з'яўляецца бібліяграфічны паказальнік «Асвета і педагагічная думка на Беларусі» (1917 – 1945 гг.) пад рэдакцыяй С.В. Снапкоўскай [5]. Упершыню ў бібліяг-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рафії прадстаўлена праграмна-метадычнае і вучэбна-метадычнае забеспячэнне навучання ў пачатковай школе нацыянальных меншасцей. Прааналізаваны матэрыялы шматлікіх перыядычных выданняў, у прыватнасці «Бальшавік Беларусі», «Советское строительство», «Штэрн», «Асвета» і інш. Апошні пачаў выходзіць у 1924 г. і адыграў значную ролю ў папулярызацыі школьнай справы нацыянальных меншасцей. У шматлікіх артыкулах на старонках часопіса пад рубрыкай «Асветніцкая палітыка» сістэматычна змяшчаліся матэрыялы аб стане польскіх, яўрэйскіх, татарскіх і інш. школ. Часопіс «Асвета» адзначаў, што праводзячы беларусізацыю, «Беларускі ўрад асаблівую ўвагу звярнуў на забеспячэнне культурных патрабаванняў нацыянальнаных меншасцей». Нацыянальнай палітыцы адводзілася ўвага і ў рубрыках «Інфармацыя і хроніка», «Аб культурным будаўніцтве БССР» і інш. У № 4 за 1926 г. у часопісе быў надрукаваны артыкул «Кароткі гістарычны нарыс сістэмы народнай асветы», а таксама дадзены параўнаўчы аналіз сістэм асветы ў РСФСР, УССР і БССР.

У Маскве выходзіў часопіс «Просвещение национальностей», дзе асвятляліся пытанні методыкі выкладання прадметаў і выпуск падручнікаў на нацыянальных мовах. У прыватнасці, праграмна-метадычны аддзел у 1929 г. змяшчаў матэрыял па выніках абмеркавання неабходнасці ўвядзення 5-гадовага тэрміну навучання ў школах нацыянальных меншасцей. Важнае месца адводзілася праблеме падрыхтоўкі нацыянальных педагагічных кадраў. У нумары 6 за 1930 год у часопісе былі падведзены вынікі дасягненняў у справе адукацыі ў Беларусі за паслякастрычніцкі перыяд. Пры гэтым адзначалася, што школа радыкальна перабудавалася ў адпаведнасці з нацыянальным складам насельніцтва рэспублікі: «існуюць школы літоўскія, латышскія, маюцца школы на нямецкай мове, украінскай і інш.». Часопіс «Просвещение национальностей» падкрэсліваў тую акалічнасць, што БССР па арганізацыі пачатковай школы была на першым месце сярод іншых саюзных рэспублік. Так, па школьным перапісе 1927/28 года на 1000 чалавек насельніцтва прыходзілася навучэнцаў у школах I ступені: у Беларусі – 8,5 %, у РСФСР – 6,7 %, ва Украіне – 7,2 %, Закаўказзі – 7,8 % (у сярэднім па Саюзе – 6,7 %).

Гісторыі і культуры беларускіх татар прысвяцілі свае навуковыя працы І.Б. Канапацкі, А.І. Смолік С.У. Думін, З.І. Канапацкая [6–10]. Э. Р. Іофэ і С.А. Кузняева разглядаюць уклад яўрэеў у развіццё беларускай культуры ў 20 – 30-я гг. XX ст. [11, 12]. Л.Л. Шкуцько і М.М. Сакалоў даследавалі яўрэйскую народную культуру як частку сістэмы народнай асветы ў Беларусі ў 1920 – 1930-я гады [13]. У.В. Тугай з'яўляецца аўтарам навуковых прац па гісторыі нямецкага і латышскага этнасаў і іх месцы ў сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі [14]. І. Вінічэнка закранае працэс фарміравання ўкраінскіх пачатковых школ на Брэстчыне [15]. Стан пачатковай адукацыі ў Беларусі ў кантэксце культуры этнічных супольнасцей (другая палова XIX – 30-я гг. XX ст.) прааналізаваны ў вучэбна-метадычным дапаможніку І.І. Забаўскай [16].

***Літаратура***

1. Карашчанка, І Нацыянальныя меншасці / І. Карашчанка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 311.
2. Очерк истории еврейского народа: ред Ш. Эттингер. – Библиотека – Алия, 1990. – 859 с.
3. Сухая, Т. Рэфармаванне адукацыі на Беларусі ў перыяд 1917–1920 гг. як перадумова пабудовы нацыянальнай школы / Т.Сухая // Нацыянальная адукацыя і полікультурная парадыгма. – Брэст, 1996. – С. 5–7.
4. Тугай, У.В. Латышы на Беларусі / У.В. Тугай. – Мінск, 1999. – С. 102 – 103.
5. Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Бібліяграфічны паказальнік. Ч. III 1917 – 1945 гг. / рэд. С.В. Снапкоўскай. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2001. – С. 234 – 238.
6. Думін, С.У., Канапацкі, І.Б. Беларускія татары. Мінулае і сучаснасць / С.У. Думін, І.Б. Канапацкі. – Мінск, 1993. – С. 203.
7. Канапацкая, З.І. Праграма «Татары на Беларусі» / З.І. Канапацкая // Роднае слова.– 2004. – № 6. – С. 109–110.
8. Канапацкі, І.Б. Мінскія татары ў міжваенны перыяд. У кн. Памяць: гістарычна-дакументальная хроніка Мінска. У 4 кн. – М., 2004. – Кн. 3.
9. Канапацкі, І.Б. Татары // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. – М., 2001. – Кн. 1. – С. 508 – 511.
10. Канапацкі, І.Б., Смолік, А.І. Гісторыя і культура беларускіх татар / І.Б. Канапацкі, А.І. Смолік. – М., 2000.



11. Іофэ, Э. Да пытання пра ўклад яўрэеў у развіццё беларускай культуры ў 20 –30-я гг. XX ст. / Э. Іофе // Беларусіка. – Мінск, 1995. – Кн. 4.
12. Кузняева, С.А. Еврейские общины Беларуси в конце XVIII – начале XX в. / С.А. Кузняева. – М., 1998.
13. Шкуцько, Л.Л., Сакалоў, М.М. Яўрэйская нацыянальная культура як частка сістэмы народнай асветы на Беларусі ў 1920 – 1930-я гады: вучэб. дапам. / Л.Л. Шкуцько, М.М. Сакалоў. – М.: БДПУ, 2001. – 30 с.
14. Тугай, У.В. Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі / У.В. Тугай. – М., 2003. – С. 305.
15. Вінічэнка, І. Украінскае школьніцтва на Брэстчыне ў 1917 г. / І.Вінічэнка // Нацыянальная адукацыя і полікультурная парадыгма. – Брэст, 1996. – С. 44–45.
16. Забаўская, І.І. Пачатковая адукацыя ў Беларусі ў кантэксце культуры этнічных супольнасцей (другая палова XIX – 30-я гг. XX ст.): вучэб.-метад. дапам. / І.І. Забаўская. – Мінск: БДПУ, 2005. – 68 с.

## Сярэдняя спецыяльная адукацыя Савецкай Беларусі ў 20-х гг. XX ст.: гістарыяграфічны агляд

***А.М. Каспяровіч, г. Мінск***

Першымі публікацыямі аб сярэдніх спецыяльных навучальных установах у Савецкай Беларусі сталі артыкулы ў перыядычных выданнях 1920 – 1930 гг.. У часопісах «Асвета», «Камуністычнае выхаванне», «Полымя», «Школа і культура Савецкай Беларусі» змяшчаліся артыкулы, прысвечаныя праблемам развіцця сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, пастаноўкі навучальнага працэсу ў іх, матэрыяльнага забеспячэння студэнтаў і выкладчыкаў, правядзенню нацыянальнай палітыкі. На працягу 1925 г. публікаваўся друкаваны орган Пралетарскага студэнцтва Беларусі – часопіс «Чырвоны сцяг», у якім асвятляліся пытанні прафсаюзнага жыцця тэхнікумаў [1]. На працягу 1920-х гг. выходзіў друкаваны орган НКА – «Вестник народного комиссариата просвещения ССРБ», дзе выдаваліся афіцыйныя пастановы і распараджэнні па народнай адукацыі [2].

Пэўныя звесткі аб ліку тэхнікумаў, колькасным складзе іх студэнцкіх і выкладчыцкіх калектываў маюцца ў статыстычных даведніках і зборніках, якія выйшлі ў даваенны час. Да іх ліку можна аднесці «Эканамічна-статыстычны даведнік», зборнік «Белорусская ССР в цифрах», статыстычны зборнік «Культурное строительство в БССР» [3].

Літаратура 1920-х гг. з'яўляецца каштоўным канкрэтна-гістарычным матэрыялам. Але большасць публікацый названага перыяду маюць інфармацыйна-статыстычны характар прадстаўлення матэрыялу і толькі ў некаторых артыкулах рабіліся спробы крытычнага асэнсавання і ацэнкі працэсу развіцця сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Разам з тым неабходна адзначыць, што ацэнка і аналіз сучаснікаў адлюстроўвала тагачасную палітыку і ідэалогію дзяржавы ў галіне пабудовы сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, фарміравання сацыяльнага і нацыянальнага складу студэнтаў і выкладчыкаў тэхнікумаў.

Большая частка даследаванняў па гэтай праблеме адносіцца да другой паловы XX ст. У гэты час савецкая гістарычная навука інтэнсіўна даследавала гістарычны вопыт стварэння і развіцця савецкай сістэмы адукацыі. Найбольш прыкметнымі працамі па названай тэме сталі даследаванні П.В. Саевіча «Народное образование за 30 лет», П.П. Сіліванчыка «Деятельность коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919–1937 гг.)», Г.С. Маханька «Борьба Коммунистической партии Советского Союза за преодоление экономической и культурной отсталости белорусского народа (1928–1937)», дзе сярод іншага паказана праца партыйных і дзяржаўных органаў рэспублікі па стварэнні і развіцці сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, падрыхтоўкі і выхавання настаўніцкіх кадраў [4]. Для ўсіх пералічаных прац характэрна асвятленне толькі пазітыўных вынікаў праводзімых савецкім урадам пераўтварэнняў у галіне народнай адукацыі. Аўтарамі падаюцца статыстычныя даныя і каменціруюцца прынятыя партыйнымі і савецкімі органамі рашэнні. Тым не менш, статыстычныя звесткі па сярэдніх спецыяльных установах БССР у 20-х гг., студэнтах і выкладчыках у іх, якія прыводзяцца ў гэтых працах, нельга назваць поўнымі і яны патрабуюць удакладнення і дапаўнення.

Да гэтага перыяду адносіцца з'яўленне ў беларускай гістарыяграфіі шэрага фундаментальных прац і змястоўных публікацый па гісторыі адукацыі, у якіх закранаюцца пытанні развіцця сеткі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ